*В. А. Буднік (Беларусь)*

# ТЫПАЛОГІЯ ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ У РАМАНЕ І. ПТАШНІКАВА «АЛІМПІЯДА»

Шматаблічны вобраз жанчыны ў сусветным мастацтве прадстаўлены ў розных іпастасях: маці, каханая, мадонна, захавальніца сям'і, родавай памяці, пакутніца, міратворца.

У беларускай духоўна-мастацкай прасторы другой паловы XX стагоддзя вобраз жанчыны-маці – адзін з самых ёмістых. Ён паяднoўвае тыпалагічныя рысы пяшчотнай і нястомнай матулі-працаўніцы, жанчыны-патрыёткі, на долю якой выпала змаганне супраць фашыстаў за волю роднай зямлі, за захаванне сям'і, дзяцей у суровы час акупацыі. У беларускай літаратуры ў драматычнай велічы прадстаўлены высокамастацкія вобразы трывушных жанчын-удоў, салдатак, чые мужы, гаспадары, каханыя загінулі на вайне ці былі рэпрэсаваны яшчэ ў даваенны час. Працай, каханнем, любоўю, самаахвярнасцю беларускіх жанчын неаднойчы ў гісторыі адраджалася жыццё на нашай зямлі. І як гэта часта бывае, у сітуацыі жыццёвай хісткасці, небяспекі жанчына-працаўніца бярэ на сябе адказнасць выратавання іншых. Лёс жанчыны, зразумела, не можа не хваляваць мастакоў, чулых да жыцця, мастакоў, занепакоеных лёсам чалавека і чалавецтва.

Годныя, хоць не заўсёды манументальныя, жаночыя вобразы створаны Я. Брылём (апавяд. «Маці», вобраз матулі ў рамане «Птушкі і гнёзды»), А. Адамовічам (вобраз Ганны Корзун, гераіні дылогіі «Партызаны», прататыпам якой стала маці пісьменніка). А. Адамовіч пісаў, што матуля пражыла тое, што стала зместам і сэнсам яго твора. Жыццё нястомнай матулі-сялянкі, як вядома, адбілася ў аповесці «Знак бяды» В. Быкава. Такіх прыкладаў мноства. Адметнае месца ў шэрагу выдатных твораў нацыянальнай прозы, дзе створаны высокамастацкі вобраз маці-працаўніцы, захавальніцы жыцця, займае раман І. Пташнікава *«Алімпіяда» (1985)*. Пісьменнік рэалістычна, псіхалагічна-дакладна ўзнаўляе напружанае, бязмерна цяжкае жыццё беларускай калгаснай вёскі 60-х гадоў XX стагоддзя, а таксама прадстаўляе шэраг пераканаўчых жаночых вобразаў.

Вобраз *Алімпіяды Падаляк* займае ў рамане галоўнае месца. Менавіта гэты вобраз арганізуе ўсю вобразную сістэму ў творы, у ім у вялікай ступені ўвасоблены адносіны аўтара да жыцця, да навакольнага свету.

Пры стварэнні вобраза галоўнай гераіні, жанчыны-маці, І. Пташнікаў абапіраўся на аўтабіяграфічны вопыт. Вядома, што ў рамане «Алімпіяда» пісьменнік увасобіў лёс роднай маці, якой у той час ужо не было. На сустрэчах з чытачамі І. Пташнікаў успамінаў, як у красавіку 43-га года маці на тры дні знікла з дому, бо даведалася, што ў далёкай вёсцы, што за трыццаць кіламетраў, гінуць каровы. Яна, маладая жанчына, прайшла семдзясят кіламетраў, каб здабыць сваім дзецям карову-карміцельку. Два дні крок за крокам, упрошваючы, падштурхоўваючы, плачучы, праклінаючы і спадзеючыся, вяла яе да вёскі. Дайшоўшы да пагорка пад дом маці і карова зваліліся пад красавіцкім сонцам. У гэтых выказваннях пісьменніка выяўлена яго творчая і жыццёвая пазіцыя. У асаблівай увазе І. Пташнікава да жанчыны-працаўніцы, сціплай, спакойнай, цярплівай, чулай, бачыцца сцвярджэнне жыццятворнага пачатку і лёсу беларускай жанчыны-маці.

Рэцыпіент разам з аўтарам захапляюцца лёсам галоўнай гераіні. Асноўныя сюжэтныя падзеі твора адбываюцца ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. Аднак вайна ўсё яшчэ жыве ў памяці і свядомасці герояў, жыхароў старэйшага пакалення, беларускіх вяскоўцаў. У драматычны ваенны і пасляваенны час адбывалася сталенне галоўнай гераіні твора Алімпіяды. Яна згадвае кароткае шчасце сямейнага жыцця, нараджэнне сына Міфодзі і дачкі Тані, заўчасную смерць мужа Мікалая. Усё яе жыццё – цяжкая, непасільная праца ў калгасе, на ферме.

Фізічная слабасць, хваравітасць вяртаюць увесь час гераіню да першых пасляваенных гадоў. Тады ўпершыню паявілася «спружына» ў вачах – прыкмета гіпертаніі. З’явілася яна не проста так, а ад непасільнай працы. Але не было часу скардзіцца. Трэба было працаваць, бо пасля вайны ўсё было разбурана, а на яе руках засталіся малыя дзеці і хворы муж. Кожны дзень многа і цяжка працавала. «Забывалася на ўсё: у вёсцы пра хваробы не думаюць і не гавораць. А калі што – кулак у вочы, разатрэ; не памагае – пастаіць, за плот узяўшыся, і зноў бяжыць. Не давалася, жыла, аж пакуль не пачула, што не жыве, а дажывае…» [1, с. 8].

У асноўнай сюжэтнай лініі І. Пташнікаў адлюстроўвае якраз той перыяд жыцця гераіні, калі яна адчула, што «дажывае». Але Алімпіяда вельмі часта ў думках звяртаецца да мінулага. Праз увесь раман рэтраспектыўным планам праходзіць усё жыццё гераіні. Алімпіяда засяроджваецца на самым важным, галоўным, тым, што вызначае мэту і сэнс існавання чалавека на свеце. Даваеннае жыццё паказана сцісла, ваеннае ліхалецце – праз нешматлікія, але памятныя драматычныя эпізоды, праз спробы ратавання параненых чырвонаармейцаў.

Алімпіяда жыве агульным клопатам вяскоўцаў-калгаснікаў, які непасільны, цяжкі, але мабілізуе яе фізічныя і духоўныя сілы. Яна жыве працай – мінулай, сучаснай, тым, што робіць, чым жыве яе вёска, яе калгас. Усё жыццё яна працавала на ферме. У гераіні ўжо няма здароўя і фізічных сіл, але кінуць працу яна не можа, бо не ўяўляе сябе без людзей, калектыўнай працы. Ферма і клопат пра жывёлу – змест яе жыцця, вельмі асабістае. Пісьменнік падкрэслівае: менавіта ў гэтай штодзённай працы заключаны глыбокі, сацыяльны і маральны сэнс жыцця гераіні і такіх, як яна, вяскоўцаў. Гераіня выяўляе светаразуменне гаспадара жыцця. Адносінамі да працы вызначаецца мараль і этыка жыхара беларускай вёскі.

Для разумення характару гераіні важнае значэнне мае апісанне ваенных падзей, калі жанчына ратуе двух параненых лётчыкаў. Алімпіяда і яе муж Мікалай, які таксама ўдзельнічае ў выратаванні байцоў, нават думкі не дапускаюць, што можна пакінуць іх без дапамогі. Ратуючы чырвонаармейцаў, яны не думалі пра небяспеку, бо гэта дапамога магла б скончыцца трагічна для ўсёй сям’і. Для Алімпіяды бездапаможныя байцы нібы яе дзеці. Схаваўшы іх у лесе, а потым, робячы ім перавязкі, гераіня зусім не думала пра сябе. Без ваганняў, яна спакойна і прывычна ўзялася выходжваць чырвонаармейцаў. Калі смяротэльная небяспека навісла над гераіняй, яна адкідвае ўсялякую дыпламатыю, спакойна і смела глядзіць у вочы здрадніку Кукаеву. Нягледзячы на пагрозу сабе, сваёй сям’і, Алімпіяда рызыкуе, застаецца чалавекам чулым, спагадлівым і сумленным. Вобраз пташнікаўскай гераіні – яшчэ адзін важны вобраз-архетып жанчыны, маці ў беларускай літаратуры. Яна – ратавальніца, ахоўніца жыцця і нястомная працаўніца.

Алімпіяда жыве сумленным, напружаным, працоўным, шчырым, зычлівым жыццём. Гераіня – чалавек вялікай душы. Яна напоўнена любоўю да ўсяго навакольнага свету: людзей, жывёлы, прыроды. Для гераіні гэта не парыў, а той нармальны стан, які дае адчуванне паўнаты і гарманічнасці існавання.

У сістэме жаночых вобразаў рамана Алімпіяда ўяўляе сабою выключэнне. Іншыя вобразы пададзены таксама ў складанасці і драматызме лёсаў, часам з аўтарскім падкрэсліваннем негатыўных момантаў у паводзінах, узаемадачыненнях і выказваннях. Алімпіяда ж пазбаўлена гэтага цалкам. У абліччы гэтай гераіні твора ў асабліва сканцэнтраваным выглядзе сабраны лепшыя духоўныя якасці, уласцівыя беларускаму жаночаму характару. На прыкладзе Алімпіяды аўтар стварыў вобраз самаахвярнай жанчыны, маці, працаўніцы, абмалёўваючы яе ў паўсядзённай нястомнасці, у сямейных адносінах, у духоўнай годнасці і маральнай прывабнасці. У вобразе Алімпіяды ўвасоблены архетыпавы для беларускай сацыякультурнай прасторы тып маці-сялянкі.

Мастацкую псіхатыпалогію беларускага нацыянальнага характару аўтар дапаўняе другараднымі гераінямі. І. Пташнікавым створаны эпізадычныя, але запамінальныя жаночыя вобразы, такія як *Гілена Чайка, Марфа, Праскурніч'я, даярка Барбара, Вольга, Шурка*, *Сцяпанаўна*. І хоць бачна знешная другараднасць гэтых вобразаў, але праз іх пісьменнік дапаўняе драматычную парадыгму ў канцэпцыі нацыянальнага жаночага характару. Агульнае гора, ваеннае ліхалецце, цяжкая праца і традыцыйная беларуская трывушнасць яднае іх.

Найбольш яркі і трагічна-балючы вобраз *Сцяпанаўны*. «Сцяпанаўне скора шэсцьдзесят. За апошнія гады яна зусім пастарэла: абвіслі шчокі, выцвілі вочы, пабялелі, як позні сон. Прамы, шырокі ўнізе паміж шчок нос пасінеў, на ім павыступалі нітачкамі жылкі і паналіваліся крывёю. Сама яна ўся ўжо абцяжэла, хадзіла, валюхаючыся з боку на бок, як старая качка ўвосень. Жыла Сцяпанаўна на свеце адна як палец» [1, с. 172]. Вайна адабрала ў гераіні ўсю сям'ю. Лёс Сцяпанаўны ўражвае сваёй жудаснай, балючай праўдай. Хоць яна і выжыла ў вайну, але назаўсёды засталася з ёй. Жыццё Сцяпанаўны спынілася разам з жыццём яе сына і мужа. З таго моманту, як вайна забрала ў яе сям'ю, гераіня ўжо не жыве, а існуе фізічна. Пасля вайны Сцяпанаўна працавала дзесьці гадоў пяць далёка ад дому на спіртзаводзе. Навучылася піць, лаяцца, як мужчына. «Рабіла на ферме доўга, аж пакуль не пачалі балець ногі ад гумавых ботаў – дзень-ноч у холадзе, у макраце, у гразі» [1, с. 173], а потым пайшла ў бальніцу санітаркай, пачала красці спірт і піць. Піла, каб хоць на нейкі час пазбавіцца ад пякельных успамінаў. Яна рэзкая, часта грубаватая, можа кожнаму сказаць балючыя непрыемныя словы, можа любога аблаяць. Але не ад злой натуры яна так робіць, яе душу зруйнавала вайна.

Нягледзячы на трагізм перажытага Сцяпанаўнай, пісьменнік заўважае, што гэтую гераіню вядзе па жыцці інстынкт працоўнага чалавека: трэба рабіць нешта, а значыць – жыць.

Сцяпанаўна паказана як ахвяра вайны. У яе вобразе заключаны трагічны пафас твора. Праз вобраз гэтай гераіні пісьменнік паказаў, што давялося перажыць беларускім жанчынам у часы вайны і як вайна паўплывала на іх лёс.

Трагізмам пазначаны лёс не толькі Сцяпанаўны. У рамане «Алімпіяда» жыццё кожнага героя мае рысы глыбокага драматызму, бо лёсы герояў увасабляюць аблічча напружаных першых пасляваенных дзесяцігоддзяў. Нават калі гэта маладыя героі, яны – дзеці трывожнага часу, неўладкаваных грамадскіх абставін.

*Таня* – дачка і спадчынніца Алімпіяды па жыцці і па духу. Яна чулая душой і ўнутрана патрабавальная. Яна не можа жыць, як набяжыць. Дзяўчына рашуча парывае са сваім юнацкім каханнем, як толькі адчула, што Ратнікаў нясе ў душы злосць і недастатковую выхаванасць. Але яна не кідаецца безразважліва насустрач новаму пачуццю. Ёй падабаецца Фірага – адзінокі чалавек, душа якога цягнецца да людской цеплыні, але нешта стрымлівае яе. Дзяўчына паказана натурай супярэчлівай, з роздумам і пачуццямі. Таня – вельмі прывабны вобраз вясковай маладой жанчыны, але ў гэтай гераіні няма вялікага кругагляду і роздуму над жыццём. Сцэна пахавання Фірагі раскрывае ва ўсёй глыбіні спрадвечную, глыбока народную якасць характару дзяўчыны – безумоўную добразычлівасць, вынослівасць. Таня не можа дапусціць, каб чалавек пайшоў з гэтага свету не аплаканы роднымі: «Закрычала, затраслася, прымаўляючы, сама не помнячы што… У чалавека дагэтуль не было свайго чалавека… Цяпер ён быў, знайшоўся і прыйшоў, каб упасці яму на грудзі апошні раз…» [1, с. 489]. Душэўную драму дачкі добра разумее Алімпіяда, і не толькі разумее: яна адчувае віну перад ёй, як і перад сынам Міфодзем, «за ўсё тое балючае, што ім давялося спаткаць у жыцці» [1, с. 527].

Праз створаныя жаночыя вобразы ў рамане «Алімпіяда» пісьменніку ўдалося выявіць менавіта народны тып жанчыны, абмаляваць і падаць яго

адпаведным нацыянальным уяўленнем беларусаў. Вобраз галоўнай гераіні, як і іншыя жаночыя вобразы-характары твора, выяўляюць аўтарскую думку аб этычна-хрысціянскай сутнасці беларускай нацыі.

**Літаратура**

1. Пташнікаў, І. Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – Т. 4 : раман. – 575 с.

*С. Ф. Бут-Гусаім (Беларусь)*

# НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ АДМЕТНАСЦЬ АНТРАПАНІМІЧНАЙ ПРАСТОРЫ ДРАМЫ ГЕОРГІЯ МАРЧУКА «ПЕЎЧЫЯ 1941 ГОДА»

Даследчыца драматургіі Георгія Марчука Т. В. Аўдоніна піша: «“Пеўчыя…” – гэта часцінка своеасаблівай гісторыі супраціўлення, якое савецкія людзі аказвалі ворагу. Адбывалася яно па-рознаму: большасць нашых суайчыннікаў змагаліся на фронце, у адкрытых баях, іншыя – у атрадах народнага апалчэння, на прадпрыемствах, што апынуліся на акупіраванай немцамі тэрыторыі. Супраціўляліся новым германскім парадкам і ваеннапалонныя ў канцэнтрацыйных лагерах – гэта быў своеасаблівы грамадзянскі подзвіг. Менавіта такі, адзін з многіх, непрыкметны подзвіг душы чалавечай адлюстраваны ў п’есе Г. Марчука сродкамі драматургіі» [1, с. 97]. Аўтар уздымае вечныя праблемы вернасці, Веры і здрадніцтва, паказаныя праз аповед пра лёсы людзей, што апынуліся ў акупацыі. «Тут няма батальных сцэн, няма гераізацыі вобразаў – ёсць камерныя глыбока ўласныя разважанні пра існасць быцця, далучэнне да Вялікай Ісціны Божага Даравання» [1, с. 97].

Назва драмы «Пеўчыя 41 года» належыць да **прадметна-апісальнага тыпу**, бо акрэслівае галоўных герояў п’есы. Створаны ў трагічныя часы акупацыі царкоўны хор ваеннапалонных дапамагае аднавіць набажэнства ў паўразбуранай вясковай цэркаўцы, дапамагае душам палешукоў і саміх пеўчых абудзіцца ад нявер’я, духоўнай глухаты, успомніць Божыя запаведзі. Харысты выжылі, дзякуючы заступніцтву святара, які забраў іх з лагера ваеннапалонных. Яны застаюцца Воінамі, накіроўваюцца, спяваючы «Свяшчэнную вайну» Б. Аляксандрава, на барацьбу з бязлітасным ворагам.

Антрапанімікон прааналізаванага твора прадстаўлены запазычанымі імёнамі, якія ўвайшлі ў айчынны іменаслоў з прыняццем хрысціянства. Так, з ***грэчаскай*** мовы прыйшлі імёны ***Варвара*** (грэч. ‘*іншаземка’* [2, с. 56]), ***Кузьма*** (грэч. ‘*упрыгожанне’* [2, с. 65]), ***Фёдар*** (грэч. ‘*божы дар’* [2, с. 61]), ***Нестар*** (грэч. ‘*які вярнуўся дадому’* [2, с. 35]), ***Прохар*** (грэч. ‘*кіраўнік хору’* [2, с. 39]), ***Генадзь*** (грэч. ‘*высакародны’* [2, с. 23]), ***Аўдоцця*** (грэч. ‘*прыхільнасць, зычлівасць, дабраслава’* [2, с. 23]), з **лацінскай: *Вікенцій*** (лац. ‘*той, хто перамагае’* [2, с. 21], **са старажытнаяўрэйскай** мовы: ***Якаў*** (ст.-яўр. ‘*перашкода’* [2, с. 51]), ***Марыя*** (ст.-яўр. ‘*пані, каханая, жаданая’* [2, с. 64), ***Сямён*** (ст.-яўр. ‘*які чуе’* [2, с. 44]), ***Міхаліна*** (ад ст.-яўр. ***Міхал*** ‘*той, хто як Бог’* [2, с. 65]), ***Фадзей*** (ст.-яўр. ‘*пахвала*’[2, с. 46]), ***Ільял*** (ст.-яўр. ‘*сіла Божая*’ [2, с. 28]).

Адлюстроўваючы тонкія нюансы міжасабовых адносін, імёны ў разнастайных жыццёвых сітуацыях ужываюцца ў выглядзе шматлікіх скарочаных (гіпакарыстычных) і эмацыянальна-ацэначных форм. Айцец Павел Фларэнскі пісаў: «Імёны гнуткія і ёмістыя, здольныя змясціць самыя розныя прыватныя абставіны, у якіх жыве асоба» [9, с. 190]. Дыяпазон эмоцый і пачуццяў, што выражаюцца з дапамогай такіх форм, надзвычай шырокі. Гэта пяшчота, сяброўская фамільярнасць, насмешка, іронія, пагарда, абраза, спачуванне. Прадстаўлены гіпакарыстычныя і эмацыянальна-ацэначныя формы імён у дра-